*Таццяна Бабіч*

# ДЗІЦЯЧЫ АНСАМБЛЬ ГАРМАНІСТАЎ «АНОШКАЎСКІЯ МУЗЫКІ»: ДА ПЫТАННЯ ВЫВУЧЭННЯ І ПЕРАЙМАННЯ ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Па ўсёй краіне ззяюць зорачкамі тысячы малых і юных талентаў, якія лічаць за гонар рэалізаваць сябе менавіта ў народнай творчасці. Яны з вялікім задавальненнем аднаўляюць забытыя песні, танцы, народныя рамёствы, вучацца іграць на старажытных інструментах, далучаюцца да духоўнай спадчыны сваіх продкаў. Народная музычная культура Міншчыны непаўторная і разнастайная. Натуральным асяродкам яе існавання з'яўляецца вёска. Да гэтага часу яна застаецца крыніцай пераемнасці каранёвых форм мыслення і паводзінаў беларусаў, фарміравання нацыянальнага характару чалавека, скарбонкай народных традыцый. Своеасаблівай «візітоўкай» Нясвіжскага раёна з'яўляецца ансамбль юных гарманістаў «Аношкаўскія музыкі» дзіцячай школы мастацтваў. Створаны інструментальны ансамбль у 1989 годзе, а ў 2001 атрымаў ганаровае званне «ўзорны». Заснавальнікам і кіраўніком калектыва з'яўляецца выкладчык Аношкаўскай дзіцячай школы мастацтваў Віктар Аляксандравіч Навумчык.

Ужо ў 1991 годдзе на абласным фестывалі юных музыкаў «Сымон-музыка» ў Стаўбцах ансамбль быў узнагароджаны дыпломам II ступені, а ў 1992 годзе – дыпломам I ступені. Творчы ўздым маленькіх гарманістаў пачаўся з 1997 годдзе, калі былі набыты для ансамбля гармонікі. Калектыў становіцца дыпламантам абласных конкурсаў і фестываляў, а ў 2000 годзе – лаўрэатам абласнога конкурсу «Іграй, гармонь» у Мар'інай Горцы. У 2001 годзе ўзорны ансамбль народнай музыкі і песні «Аношкаўскія музыкі» быў запрошаны на II фестываль «Іграй, гармонь», што праходзіў у Маладзечна. Але і адтуль аношкаўцы вярнуліся з перамогай, дзякуючы спявачцы Валянціне Шарапа, якая выступала разам са сваімі землякамі і стала лаўрэатам, заняўшы I месца сярод прыпевачніц. Безумоўна, самай яскравай і запамінальнай падзеяй для маленькіх музыкаў з Аношак стала перамога і атрыманне ганаровага звання «лаўрэата» на міжнародным фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» у 2003 годзе ў Паставах. Калектыў актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх, абласных, і рэгіянальных народных святах і арт-праектах, сярод якіх «Славянскі базар», «Напеў зямлі маёй», кірмаш «Дажынкі» і інш.

За усе дваццаць гадоў існавання «Аношкаўскія музыкі» папулярызавалі інструментальныя традыцыі свайго краю на шматлікіх конкурсах і фестывалях, канцэртах і творчых сустрэчах. Калектыў вылучаецца сваёй самабытнасцю, віртуозным майстэрствам ігры на музычных інструментах, непаўторнасцю тэмбравай палітры гучання і дыяпазонам галасоў. Усе канцэрты ансамбля гарманістаў маюць вялікі поспех, а жыхарам Нясвіжскага раёна гэты калектыў упадабаўся за традыцыйнае і адначасова арыгінальнае гучанне народных песенных і танцавальных мелодый і непаўторны каларыт. Калі патрэба, музыкі выступаюць і на святочных канцэртных пляцоўках, народных вясковых святах. І гэта – сведчанне знітаванасці яго ўдзельнікаў з вясковым ладам жыцця, яго каранёвымі традыцыямі.

Акрамя роднай Міншчыны ансамбль шмат гастралюе па Беларусі і за яе межамі – у Расіі, Украіне. З творчымі паездкамі пабывалі ў Францыі, куды іх накіравала абласное ўпраўленне культуры, у Польшчы, дзе праходзілі Дні Нясвіжа, у Германіі (г. Лайхенген), адбыліся гастролі ў Турцыі. Гэтым ён робіць значны ўнёсак ва ўзмацненне культурных сувязяў паміж народамі, папулярызуе беларускае народнае мастацтва па-за межамі краіны. Юныя гарманісты выступалі на абласным радыё ў перадачы «Спявай, душа народная», радыёпраграме «Раніца», удзельнічалі ў тэлепраграме «Сузор'е надзей».

Першыя гады дзейнасці гурта былі часамі пошуку свайга творчага аблічча і арыгінальнага рэпертуару. Праца ансамбля вылучаецца наватарскімі пошукамі: традыцыйныя вытокі інструментальнай і спеўнай культуры спалучаюцца з сучаснымі тэндэнцыямі. Кіраўнік калектыва, Віктар Навумчык, ставіць на мэце папулярызацыю спрадвечных народных музычных традыцый Беларусі сярод сучаснага мясцовага насельніцтва (асабліва моладзі), захаванне беларускай нацыянальнай музычнай культуры. Вынікам яго самаадданай шматгадовай працы з'яўляецца назапашаны цікавы рознажанравы і рознахарактарны рэпертуар, які складаюць беларускія народныя танцы ў аўтарскай апрацоўцы В. Навумчыка («Сялянская полька», «Полька весялушка», «Святочны вальс», «Полька выхвалякі» і інш.), прыпеўкі, беларускія народныя песні («Купалінка»). Значнае месца ў репертуары займаюць аўтарскія творы В. Навумчыка – «Прывітальная» (словы Я. Купалы), «Карункі з куфэрка Радзівілаў», «Парамонава бяда», «Пра беларусаў» (словы В. Навумчыка), а таксама іншых самадзейнах і прафесіных кампазітараў – «Гэй, музыкі», «Банька дзеравенская» (словы Б. Асмолаўскага, музыка А. Кавалёва), «Грайце, грайце дударыкі» (музыка і словы П. Бертрашэвіча), «Полька», «Козачка белая» (музыка М. Сіраты) і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Малюнак 1* – Узорны ансамбль «Аношкаўскія музыкі» (кіраўнік – В.А. Навумчык)

Творчая дзейнасць «Аношкаўскіх музыкаў» скіравана на забеспячэнне пераемнасці духоўных і мастацкіх традыцый беларускай вёскі, гарманічнае выхаванне асобы на лепшых узорах народнага мастацтва, фарміраванне нацыянальнай і патрыятычнай самасвядомасці праз далучэнне дзяцей і моладзі да багатай культурнай спадчыны сваёй малай Бацькаўшчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ